УДК 882.6 - 1"19"Т

**Г.П. Харошка**

# Аб жанравай прыродзе і вобразнай структуры паэмы "Тарас на Парнасе"

Агульнавядома, што кожны літаратурны жанр мае свае вытокі, мае сваю гісторыю ўзнікнення і паходжання. Гэта датычыцца і нацыянальнай паэмы. Каб сцвердзіць сябе і цалкам сфарміравацца ў асобную, самастойную жанравую з'яву, паэма прайшла даволі складаны, а часам супярэчлівы шлях у сваім развіцці.

З гісторыі літаратуры вядома, што паэма вырастала на глебе народна-песенных традыцый, камічнага бурлеска, ананімных гутарак і іншых жанравых форм і адгалінаванняў. Да першых праяў паэмнага жанру, як сёння прынята лічыць, можна аднесці некаторыя творы аратарскага мастацтва старажытнага

перыяду ("Слова аб палку Ігаравым", "Песня пра зубра" М. Гусоўскага, "Пруская вайна" В. Вісліцкага і інш.). Несумненна, гэтыя выдатныя помнікі старажытнай літаратуры аказалі значны ўплыў на станаўленне вершаванага беларускага ліра-эпасу, яго нацыянальную спецiфіку.

Асаблівую цікавасць выклікаюць сёння паэмныя творы, якія былі напісаны ў XIX ст. Па сённяшні дзень так да канца і не высветлена іх жанравая прырода, не вывучана вобразная структура. Неабходна прызнаць, што паэма ў XIX ст. была тым жанрам, які самым непасрэдным чынам выводзіў яе на прасторы гістарычнага развіцця нацыянальнай беларускай літаратуры. Паэма як бы адкрывала новую старонку не толькі у гісторыі беларускай паэзіі, але і сцвярджала зусім новыя эстэтычныя густы і прынцыпы – народнасць. Няма нічога выпадковага ў тым, што ў беларускай дакастрычніцкай літаратуры менавіта жанр паэмы быў вядучым, што менавіта на гэты жанр была скіравана павышаная увага беларускіх майстроў слова. Так як у самой ідэйна мастацкай сутнасці, у эстэтыцы гэтага жанра таіліся тыя магчымасці, якія былі найбольш важнымі і актуальнымі для працэсу станаўлення якасна новай беларускай паэмы. І як бы пацвярджэннем сказанаму з'яўляецца паэма "Тарас на Парнасе". Сёння некаторыя даследчыкі (Г. Кісялёў) схільны лічыць, што яе напісаў К. Вераніцын. Магчыма з гэтым доводам вучонага можна пагадзіцца, час пакажа. Тым не менш, паэма аказалася адметнай з'явай у беларускай літаратуры XIX ст., гэта, як бы мовіць, шэдэўр нацыянальнага вершаванага мастацтва. Аднак, на жаль, паэма засталася на сённяшні дзень тым творам дакастрычніцкай літаратуры, які не атрымаў належнай ацэнкі ў айчынным літаратуразнаўстве, асабліва што датычыцца яго жанравай прыроды і вобразнай структуры. У гэтым накірунку яшчэ патрэбна шмат працаваць. Па разуменню некаторых даследчыкаў і тэарэтыкаў літаратуры паэма "Тарас на Парнасе" асэнсоўваецца як чысты парадыйны твор на класіцызм, нават існуе спроба паставіць паэму побач з "Энеідай", сцвярджаючы, што тут шмат агульнага, таму што творы напісаны па канонах парадыйнага жанру. Невыпадкова літаратуразнаўца С. Майхровіч катэгарычна падкрэслівае, што па жанравай структуры "Тарас на Парнасе" – гэта парадыйна-сатырычная паэма [1]. На наш погляд, такая пазіцыя вучоных да вызначэння жанравай прыроды паэмы "Тарас на Парнасе" з'яўляецца недастаткова абгрунтаванай, яна да таго ж і спрэчная. Сцвярджэнне паважаных даследчыкаў само па сабе, як нам бачыцца, паспешлівае і не мае пад сабой сур'ёзнай гістарычнай падставы.

Калі мы ўважліва пранікнемся ў сутнасць самога пытання, і калі прасочым перыядызацыю развіцця беларускай літаратуры, то літаральна заўважым, што класіцызм як з'ява ў нацыянальнай літаратуры сярэдзіны XIX ст. сябе амаль што зжыў (А ці быў ён у нацыянальным мастацтве ўвогуле? Тут таксама існуе яшчэ пытанне.). І таму ўплыў яго на паэму надта слабы. Канешне, ніхто не адмаўляе прысутнасць парадыйных элементаў у творы. Яны існуюць. Але яны настолькі нязначныя, што іх можна і не заўважыць. Іншае можна сказаць пра "Энеіду", дзе парадыйнасць у творы найбольш выражана. Магчыма, перад творцамі стаялі розныя эстэтычныя задачы. Паэма "Тарас на Парнасе" адрозніваецца ад "Энеіды" сваім ідейным зместам і нават формай. У творы больш дамінуе жартоўна-гумарыстычны пачатак, ён жывы і дзейсны. Тут, магчыма, аўтар паэмы не мог не ўлічыць ужо вядомыя да таго часу традыцыі рускай, польскай і ўкраінскай класікі і ў першую чаргу традыцыі А. Пушкина, М.Гогаля, А. Міцкевіча і Т. Шаўчэнкі. Таму ў паэме выразна заўважаецца, што аўтар спрабуе неяк адштурхнуцца ад бурлеска і самой пародыі. І гэта яму ўдаецца. У канву паэмы "Тарас на Парнасе" ўсё часцей і часцей пранікае лірыка-жартоўная плынь, а з ей і схільнасць аўтара да паэтызацыі простага чалавека, яго пачуццяў. І калі "Энеіда навыварат", па выразу М. Лазарука была

свайго роду "антыпаэма", то "Тарас на Парнасе" атрымалася глыбоканацыянальным як па эместу, так і па форме мастацкім творам. Да сказанага трэба дадаць, што паэма па сваей ідэйна-мастацкай задуме – твор яшчэ і самабытны. Ён напісаны тонка, з вялікім паэтычным тактам і густам. У ім "няма і ценю той наўмыснай прасталінейнаеці, якую можна бачыць у ранейшых бурлескных творах (А. Лойка)". А гэта дае падставу глядзець на паэму не як на пародыю, а як на карціну са скрытым значэннем, у якой за пераапранутымі "багамі" хаваюцца адзнакі літаратурнага жыцця і барацьбы, аўтарскія погляды на сапраўднае мастацтва. Па свайму зместу і аўтарскай пазіцыі паэма, несумненна, скіравана супраць кансерватыўных тендэнцый ліберальна-шляхецкай народнасці, яна была накіравана ў той час на асуджэнне рэакцыйнай эстэтыкі Булгарына і Грэча, якая, зжываючы сябе, была тормазам для развіцця больш прагрэсіўнай літаратуры. Але паэма была вартая і ў другім плане: яна не толькі сцвярджала крытыку пануючых эстэтычных густаў і прынцыпаў, але і падкрэслівала аўтарскі ідэал – прагу да рэалізму. Акрамя таго, твор па жанравай прыродзе вельмі зграбны і ўдалы па структуры, па развароту сюжэта, па версіфікацыі і вершу. Тут нельга не пагадзіцца з літаратуразнаўцам М. Арочкам, які сцвярджае,што "паэма больш кампактная, кампазіцыйна завершаная, майстэрская ў сэнсе самой культуры вершаванага радка" [2]. Аўтар паэмы даволі глыбока і пранікнёна выявіў (у параўнанні з папярэднімі літаратурнымі творамі) характар, жыццё, быт і манеру мыслення беларускага селяніна, яго таленавітасць, нацыянальнае аблічча. Такім яго робіць вобраз Тараса, палясоўшчыка з Пуцявішча:

*Ён там ля лазні блізка жыў.*
*Што ж? Чалавек ён быў рахманы,*
*Гарэлкі ў губу ён не браў!*
*Затое ж у ласцы быў у пана, –*
*Яго пан дужа шанаваў* [1].

Як бачым, вобраз рэалістычны, герой паводзіць сябе так, як гэта вымагала само жыццё, і ніякай пародыі ці намёка на яе няма. Аўтар паэмы не толькі ўводзіць у твор чалавека з народа – селяніна Тараса як увасабленне людзей пэўнага сацыяльнага асяроддзя, а больш таго, робіць яго цэнтральным героем твора. Гэта было надзвычай важным у той час для паэмнага жанру. "Увядзенне" у паэму не выдуманага, а сапраўднага, жывога селяніна ў якасці галоўнага героя дало аўтару магчымасць стварыць глыбокі мастацкі вобраз, закрануць балючыя пытанні таго часу. М. Лазарук справядліва падкрэслівае: "...аўтарам кіравала не толькі і не столькі жаданне стварыць канкрэтны вобраз беларускага селяніна, колькі імкненне выявіць свае адносіны да літаратурнага жыцця у шырокім плане" [4]. Сапраўды, вобраз Тараса атрымаўся на славу. Ён у пэўнай ступені апаэтызаваны і разам з тым індывідуалізаваны. Тарас вылучаецца дасціпным розумам, кемлівасцю і прыродным вострым гумарам. А гэта падкрэслівае ў героя моманты народнага светаразумення і нацыянальнага характару:

*Ніяк Тарас наш не ўцярпеў,*
*І з лавы ён, што меўшы духу,*
*Скакаць на хату паляцеў.*
*Як стаў прыстуківаць атопкам,*
*Аж рот разінулі багі:*
*То ён прысвісне, то прытопне,*
*То шпарка пойдзе ў кругі* [1].

З фактычнага матэрыялу вынікае, што аўтар паэмы валодаў дастатковым паэтычныы вопытам, майстэрствам у стварэнні псіхалагічнага глыбокага па-

эмнага вобраза. Але на думку А. Лойкі, стварэнне вобраза селяніна – гэта не самамэта творцы, паэму ніяк нельга разглядаць як забаўнае апавяданне пра лесніка Тараса і яго дзіуныя прыгоды. Хутчэй за ўсё гэта быў клопат паэта пра лёс беларускай літаратуры і яе народнасць [4]. Паэма была скіравана супраць таго дваранскага мастацтва, якое заігрывала з народнасцю, прэтэндуючы на народнасць, маскіруючыся пад аблічча рэакцыйных інтрыганаў. І аўтар ўсё гэта тонка высмеяў у паэме, надаўшы ей жартоўна-сатырычны змест.

Усё вышэйпададзенае дазваляе сказаць, што паэма "Тарас на Парнасе" па сваей структурнай зладжанасці, кампазіцыйнай завершанасці з'яўляецца ў нашай нацыянальнай літаратуры адным з яркіх узораў сатырычна-жартоўнай сюжэтнай паэмы. Твор канца XIX ст. сапраўды мае тэндэнцыю прыбліжэння да гэтай жанравай разнавіднасці вершаванага эпасу. Аб гэтым сведчыць у паэме наяўнасць лірычнага элемента, своесаблівага героя-гумарыста, селяніна-расказчыка. У камічную аснову твора часта трапляе элемент сацыяльнай крытыкі. А гэта наводзіць нас на яшчэ адну думку: што аўтар, дзякуючы свайму таленту, фарміраваў адначасова і рэалістычную нацыянальную паэму, якая пазней больш глыбока і поўна праявіцца ў творчасці Багушэвіча, Лучыны, Купалы.

Важна адзначыць яшчэ і тое, што, з пункту гледжання эстэтычнага, паэма "Тарас на Парнасе" багатая і на мову. Лексіка ў творы дасканалая, яна разнастайная ў сінаніміцы. У творы прысутнічае выразны паэмны стыль, часам сустракаецца ёмістая афарыстычнасць, а гэта адзнакі вялікага таленту паэта. Прываблівае твор сваім цікавым паэтычным мысленнем, што ў сваю чаргу дазваляе аўтару больш тонка і глыбока паказаць духоўны свет героя і вызначыць межы вершаванага жанру.

Такім чынам, створаны паэмны варыянт "Тарас на Парнасе" дазваляе сцвярджаць, што аўтар сваім творам як бы падагульняў жанравыя і ідэйна-эстэтычныя пошукі паэмнага жанру XIX ст. Яго з'яўленне ў літаратуры стымулявала далейшы ход развіцця жанравых форм ліра-эпасу, узбагачаючы яго новымі матывамі і вобразамі, новымі рытмамі і інтанацыямі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Энеіда навыварат і Тарас на Парнасе*** Мн., 1953. С. 24, 67, 78.
2. ***Арочка М.М.*** Беларуская савецкая паэма. Мн., 1979. С. 10.
3. ***Лазарук М.А.*** Станаўленне беларускай паэмы. Мн., 1969. С. 181.
4. ***Лойка А.А.*** Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч. 1. Мн., 1977. С. 121-131.


## S U M M A R Y


*The problem of genre is still sign ticant for the national literature studies and criticism. That's why the author tries to define genve specific character of the work, which is based on the actual material of the poem "Taras on Parnas". It is emphasized that according to its structure and compositional comletion it is one of the brightest examples of a satirical-humorous plot poem in the national Belarusian literature, but it is not a burlesque poem, as it was maintained in criticism before.*